УДК 373.31

# Тэарэтычныя аспекты фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў І–ІV класаў

**Н. У. МУРАШКА,**
настаўнік пачатковых класаў СШ № 196 г. Мінска, магістр,
**А. С. ШЫЛАВА,**
дацэнт кафедры менеджменту і адукацыйных тэхналогій
факультэта кіравання і прафесійнага развіцця педагогаў ІПКіП БДПУ
кандыдат педагагічных навук, дацэнт

*Анатацыя: праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць разумення яе сутнасці для пошуку і ўкаранення новых падыходаў, якія б спрыялі эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечвалі дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці.*

*Annotation: the problem of formation of communicative and speech competence at the 1st stage of General secondary education makes it necessary to understand its essence in order to find and implement new approaches that would contribute to the effective assimilation of knowledge and ensured the achievement of pre-designed results based on the interaction of the subjects of the activity.*

*Ключавыя словы: пачатковае навучанне, кампетэнтнасны падыход, маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя, камунікацыя, маўленне, маўленчая дзейнасць, камунікатыўныя ўменні.*

*Key words: primary teaching, competence approach, communicative and speech competence, communication, speaking, speech activity, communication skills.*

**Уводзіны**

Фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў І–ІV класаў з'яўляецца актуальнай праблемай у сучаснай педагагічнай практыцы. Для яе вырашэння найперш неабходна разуменне сутнасці і зместу маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

Увядзенне кампетэнцый у сучасны адукацыйны працэс накіравана на дапамогу навучэнцу ў сітуацыі, калі ён, валодаючы наборам тэарэтычных ведаў, адчувае цяжкасці ў іх выкарыстанні для рашэння канкрэтных жыццёвых задач. Кампетэнтнасны падыход у навучанні прадугледжвае засваенне ведаў не паасобку, а ў комплексе. У сувязі з гэтым адбываецца мадэрнізацыя адукацыйнага працэсу на аснове кампетэнтнаснага падыходу.

Кампетэнтнасны падыход адзначаны ў якасці асноўнага патрабавання да арганізацыі адукацыйнага працэсу ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (артыкул 91), таму важнай задачай сучаснай школы з'яўляецца фарміраванне ў навучэнцаў асноўных кампетэнцый на ўсіх ступенях агульнай сярэдняй адукацыі. Для рэалізацыі кам-

петэнтнаснага падыходу ў вучэбных праграмах I ступені агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Літаратурнае чытанне» для агульнаадукацыйных школ з рускай мовай навучання вызначаны набор адпаведных кампетэнцый, дзе адной з галоўных з'яўляецца маўленча-камунікатыўная.

Згодна з А. В. Хутарскім, кампетэнтнасны падыход да навучання прадугледжвае фарміраванне ў навучэнца пэўнай сукупнасці ключавых кампетэнцый па розных вучэбных прадметах [1].

Пад ключавымі кампетэнцыямі маюцца на ўвазе найбольш універсальныя па характары і ступені выкарыстання кампетэнцыі. Іх фарміраванне ажыццяўляецца ў рамках кожнага вучэбнага прадмета. Па сутнасці, яны з'яўляюцца надпрадметнымі.

Вучэбныя праграмы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі пабудаваны з улікам кампетэнтнаснага падыходу і прадугледжваюць фарміраванне моўнай, маўленча-камунікатыўнай, лінгвакультуралагічнай, сацыякультурнай кампетэнцый у межах вучэбнага прадмета «Беларуская мова» і сацыякультурнай, асобаснай, маўленча-камунікатыўнай кампетэнцый у межах вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне».

Такім чынам, маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя з'яўляецца адной з ключавых прадметных кампетэнцый згодна з вучэбнымі праграмамі вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Літаратурнае чытанне» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

### Тэарэтычны агляд сучасных падыходаў да трактоўкі паняцця «маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя»

Пад **маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыяй** разумеюць «здольнасць і рэальную гатоўнасць да зносін адэкватна мэтам, сферам і сітуацыям зносін, гатоўнасць да маўленчага ўзаемадзеяння і разумення» [2, с. 27]. Як адзначае А. А. Быстрова, «...маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя складаецца з ведаў аб моваазнаўчых паняццях і камунікатыўных уменнях» [2, с. 27].

Для разумення сутнасці і зместу маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі мэтазгодна ўдакладніць значэнне ключавых паняццяў **камунікацыя** і **зносіны**, **маўленне** і **маўленчая дзейнасць**, раскрыць паняцці **ўменні**, **камунікатыўныя ўменні**, якія выкарыстоўваюцца ў дачыненні да навучэнцаў малодшага школьнага ўзросту.

У навуковых даследаваннях тэрміны **камунікацыя** і **зносіны** прадстаўлены па-рознаму. У адных крыніцах яны атаясамліваюцца, у іншых — вызначаюцца як роднасныя, аднак не ідэнтычныя.

Прааналізуем іх дэфініцыі, прапанаваныя рознымі навукамі.

Філасофія даволі шырока трактуе феномен **камунікацыя** і інтэрпрэтуе яго наступным чынам:

- «...сродкі сувязі любых аб'ектаў матэрыяльнага або духоўнага свету» [3, с. 8];
- «...паведамленне, перадача інфармацыі — сэнсавы і ідэальна-змястоўны аспект сацыяльнага ўзаемадзеяння [4, с. 191];
- «...сістэма, у якой ажыццяўляецца ўзаемадзеянне; працэс узаемадзеяння; спосабы зносін, якія дазваляюць ствараць, перадаваць і прымаць разнастайную інфармацыю» [5, с. 10–11].

Так, з пункту гледжання філасофіі, паняцце **камунікацыя** суадносіцца з паняццем **зносіны**.

У псіхалогіі **камунікацыя** — гэта зносіны, перадача інфармацыі ад чалавека да чалавека, спецыфічная форма ўзаемадзеяння людзей у працэсе іх пазнавальна-працоўнай дзейнасці, якая ажыццяўляецца галоўным чынам пры дапамозе мовы [6]. **Зносіны** — складаны шматпланавы працэс устанаўлення і развіцця кантактаў паміж людзьмі (міжасобасныя) і групамі (міжгрупавыя), які вызначаецца патрэбамі сумеснай дзейнасці і ўключае ў сябе як мінімум тры розныя працэсы: камунікацыю (абмен інфармацыяй), інтэракцыю (абмен дзеяннямі) і сацыяльную перцэпцыю (успрыманне і разуменне партнёра) [6].

У педагогіцы пад **камунікацыяй** разумеюць зносіны ці перадачу інфармацыі іншаму чалавеку або групе асоб без выкарыстання мовы [7], а пад **зносінамі** — узаемадзеянне двух або больш людзей, якое заключаецца ў абмене паміж імі пазнавальнай або эмацыянальнай інфармацыяй, вопытам, ведамі, уменнямі, навыкамі [7].




З гэтага вынікае, што і псіхалогія, і педагогіка падаюць паняцці **камунікацыя** і **зносіны** як блізкія таму, што камунікацыя, з аднаго боку, з'яўляецца часткай працэсу зносін, а з другога — вызначаецца як зносіны і не зводзіцца толькі да працэсу перадачы інфармацыі.

У даследаваннях навукоўцаў, якія працуюць у галіне камунікацыі і зносін, такіх як А. А. Лявонцьеў, М. І. Лісіна, Л. Р. Мунірава, Р. С. Немаў, **камунікацыя** таксама выступае як сінонім паняцця **зносіны**.

Гэта можа азначаць, што камунікацыя і зносіны заўсёды знаходзяцца побач, а ў пэўных выпадках нават з'яўляюцца ідэнтычнымі.

Камунікацыя і зносіны цесна звязаны з паняццямі **маўленне** і **маўленчая дзейнасць**. Разгледзім больш падрабязна, як названыя тэрміны раскрываюцца ў працах навукоўцаў — А. А. Лявонцьева, прадстаўніка псіхалогіі, і Н. С. Старжынскай, прадстаўніка педагогікі.

Так, А. А. Лявонцьеў пад **маўленнем** разумее ўніверсальны сродак зносін, складаную і спецыяльна арганізаваную форму свядомай дзейнасці, у якой удзельнічаюць два суб'екты: той, хто фарміруе маўленчае выказванне, і той, хто ўспрымае выказванне [8], а пад **маўленчай дзейнасцю** — працэс выкарыстання мовы для зносін падчас якой-небудзь іншай чалавечай дзейнасці [8].

Н. С. Старжынская вызначае **маўленне** як «...сродак зносін у дзеянні (рэалізацыі)» [9, с. 4], а **маўленчую дзейнасць** як «...дзеянне і яго прадукт (перавод пэўнага зместу ў выказванне, тэкст — пры гаварэнні, здабыванне зместу з тэксту пры слуханні), якія заўсёды матываваны — выкліканы пэўнымі абставінамі» [9, с. 4].

Аналіз гэтых дэфініцый паказвае, што **маўленне** вызначаецца як сродак зносін людзей пры дапамозе мовы, а **маўленчая дзейнасць** разглядаецца як мэтанакіраванае выкарыстанне мовы ў працэсе зносін. Такім чынам, у псіхолага-педагагічнай навуковай літаратуры маўленне і маўленчая дзейнасць з'яўляюцца часткай агульнага працэсу зносін і камунікацыі.




У малодшым школьным узросце камунікацыя і зносіны, а з імі і маўленчая дзейнасць, пачынаюць займаць усё большае месца. У гэты перыяд дзіця дакладна ведае, што для яго важна ўступаць у стасункі з іншымі дзецьмі, і аддае перавагу зносінам з імі. У працэсе навучання, у працэсе калектыўнай і групавой работы школьнікі паступова авалодваюць пэўнымі ўменнямі, неабходнымі для зносін.



Пад **уменнямі** маецца на ўвазе «...падрыхтаванасць да практычных і тэарэтычных дзеянняў, якія выконваюцца хутка, дакладна, свядома, на аснове засвоеных ведаў і жыццёвага вопыту. Уменні фарміруюцца шляхам практыкаванняў і ствараюць магчымасць выканання дзеяння не толькі ў звыклых, але і ў новых умовах» [7, с. 153]. Уменні неабходна адрозніваць ад навыкаў. **Навык** — гэта «...дзеянне, даведзенае да аўтаматызму; фарміруецца шляхам шматразовага паўтарэння» [7, с. 90].

Звернемся да раскрыцця паняцця **камунікатыўныя ўменні**.

Згаданы тэрмін разглядаецца рознымі навукамі, але для нашага даследавання найбольшую цікавасць уяўляе яго вызначэнне ў псіхалогіі і педагогіцы.

З гісторыі педагогікі вядома, што К. Д. Ушынскі і В. І. Чарнышоў лічылі адной з важных мэт адукацыі падрыхтоўку навучэнцаў да практычнай дзейнасці, для якой неабходны рэальныя прыкладныя веды. Даследчыкі ўказвалі на неабходнасць фарміравання ў школьнікаў розных уменняў, у тым ліку лёгка, зразумела, прыгожа гаварыць на сваёй мове. Так, яны сфармулявалі сутнасць паняцця **камунікатыўныя ўменні**, не называючы гэтага тэрміна.

У сучасных працах па педагогіцы і псіхалогіі М. І. Лісінай, Р. С. Немава можна сустрэць вызначэнне гэтага паняцця як уменне зносін. Яно дае дакладнае ўяўленне аб тым, што пад камунікатыўнымі ўменнямі мы павінны мець на ўвазе:

- уменне вусна і пісьмова перадаваць інфармацыю;
- уменне прымаць інфармацыю з патрэбным сэнсам;
- уменне слухаць;
- уменне разумець іншага.

Такім чынам, у даследаваннях педагогаў і псіхолагаў камунікатыўныя ўменні разумеюцца як індывідуальныя якасці асобы вучня, якія цесна звязаны з маўленчай дзейнасцю і ўяўляюць сабой сукупнасць простых уменняў, неабходных дзіцяці для зносін, навучання, узаемадзеяння ў калектыве, а таксама для асобаснага развіцця.

Паколькі маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя з'яўляецца складанай, яе змест уключае:

- валоданне рознымі відамі маўленчай дзейнасці [10];
- фарміраванне маўленчых паводзін, адэкватных мэтам і сітуацыям зносін [10];
- уменні выкарыстоўваць лексічныя адзінкі ў адпаведнасці з іх значэннем, выбіраць патрэбную моўную форму і спосабы выказвання думкі ў залежнасці ад умоў камунікацыі [10];
- развіццё вобразнага ўяўлення, маўленчай актыўнасці, здольнасці да літаратурнай творчасці на падставе ўспрынятых твораў мастацкай літаратуры [11];
- фарміраванне агульнавучэбных уменняў працы з тэкставай інфармацыяй розных відаў [11].

### Заключэнне

У выніку экскурсу ў праблему ўдакладнення сутнасці і зместу маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, мы прыйшлі да высновы, што згаданая кампетэнцыя вызначаецца наступнымі характарыстыкамі.

1. З'яўляецца складанай і ўключае ў сябе тэарэтычныя веды пра мову і камунікатыўныя ўменні, якія ў ходзе пастаянных практыкаванняў аўтаматызуюцца, даводзяцца да навыку.
2. З'яўляецца ўсвядомленымі камунікатыўнымі дзеяннямі дзяцей, што праяўляецца ў іх здольнасці будаваць зносіны ў адпаведнасці з сітуацыяй і асобай партнёра, аналізаваць і ацэньваць камунікатыўныя кантакты з аднагодкамі і дарослымі.
3. Уключае ў сябе азнаямленне навучэнцаў са сродкамі і спосабамі зносін, практычнае ажыццяўленне дзеянняў ва ўмовах камунікатыўнай дзейнасці.

Веданне сутнасці і зместу маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі дазволіць настаўнікам у адукацыйным працэсе сфарміраваць яе ў навучэнцаў I–IV класаў на высокім узроўні.

#### Спіс выкарыстаных крыніц


1. Хуторской, А. В. Методологические основания применения компетентностного подхода к проектированию образования / А. В. Хуторской // Высшее образование в России. — 2017. — № 12. — С. 85–91.
2. Быстрова, Е. А. Обучение русскому языку в школе : учеб. пособие для студентов педагогических вузов / Е. А. Быстрова, С. И. Львова, В. И. Капинос и др.; под ред. Е. А. Быстровой. — 2-е изд., стер. — М. : Дрофа, 2007. — 237 с.
3. Обучение русскому языку в школе : учеб. пособие для студентов пед. вузов / Е. А. Быстрова [и др.] ; под ред. Е. А. Быстровой. — 2-е изд., стер. — М. : Дрофа, 2007. — 237 с.
4. Новейший философский словарь / сост. А. А. Грицанов. — 3-е изд., испр. — Минск : Кн. Дом, 2003. — 1280 с.
5. Шарков, Ф. И. Коммуникология: основы теории коммуникации : учеб. для бакалавров / Ф. И. Шарков. — 4-е изд. — М. : Дашков и К°, 2017. — 488 с.
6. Словарь-справочник по возрастной и педагогической психологии : учеб. пособие / сост. Е. О. Бурачевская, Н. Ю. Скороходова. — Петрозаводск : ПИН, 2011. — 100 с.
7. Коджаспирова, Г. М. Словарь по педагогике / Г. М. Коджаспирова, А. Ю. Коджаспиров. — М. : Академия, 2003. — 176 с.
8. Леонтьев, А. А. Психология общения : учеб. пособие для студентов высш. учеб. заведений, обучающихся по специальности «Психология» / А. А. Леонтьев. — 4-е изд. - М. : Академия : Смысл, 2007. — 365 с.
9. Старжынская, Н. С. Методыка развіцця роднай мовы : вучэб. дапам. / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна.— 2-е выд., выпр. — Мінск : Выш. шк., 2008. — 301 с.
10. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання [Электронны рэсурс] / Нац. адукацыйны партал Нац. ін-та адукацыі. — Рэжым доступу : https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2020-2021-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2020-2021/303-uchebnye-predmety-i-iv-klassy-2020-2021/3799-ii-klass.html. — Дата доступу : 12.01.2021.
11. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання [Электронны рэсурс] / Нац. адукацыйны партал Нац. ін-та адукацыі. — Рэжым доступу : https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2020-2021-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2020-2021/303-uchebnye-predmety-i-iv-klassy-2020-2021/3799-ii-klass.html. — Дата доступу : 12.01.2021.


**Артыкул паступіў у рэдакцыю 09.03.2021**